УДК 811.161.3

Нацыянальная адметнасць прыказкавага фонду беларускай мовы

Петрушэўская Ю. А.
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова

У артыкуле вызначаецца і дыферэнцыюецца нацыянальны кампанент прыказкавага фонду (парэмікона) беларускай мовы.

Мэта – вызначыць аб'ём і структуру нацыянальнага (спецыфічнага) кампанента, ступень яго нацыянальна-культурнай абумоўленасці, суадносіны з іншанацыянальным (агульным) кампанентам у парэміконе беларускай мовы.

Матэрыял і метады. *У даследаванні выкарыстаны дэскрыптыўны і супастаўляльны метады, методыкі структурна-семантычнага мадэлявання, лінгвакультуралагічнага апісання, колькаснага аналізу і інш. Матэрыялам даследавання з'яўляюцца адзінкі прыказкавага мінімуму, асноўнага прыказкавага фонду, прыказкавага складу сучаснай літаратурнай мовы (усяго каля 1500 прыказак і больш за 5000 іх варыянтаў).*

Вынікі і іх абмеркаванне. *У парэміконе беларускай мовы спалучаюцца агульны з іншымі мовамі (інтэрнацыянальны ці ўніверсальны) і спецыфічны (уласна нацыянальны) кампаненты. Нацыянальна адметная частка парэмікона складаецца не толькі з адзінак уласна беларускага паходжання, але і з нацыянальна дэтэрмінаваных варыянтаў іншамоўных і агульных з іншымі мовамі прыказак. Значная частка прыказак запазычаных з іншых моў ці агульных з іншымі мовамі асімілявалі ў беларускай мове, набылі нацыянальна маркіраваныя элементы і ўспрымаюцца носьбітамі мовы як уласна беларускія.*

Заключэнне. *У складзе нацыянальнага кампанента ў парэміконе беларускай мовы пераважаюць не ўласна беларускія па паходжанню адзінкі, а нацыянальна дэтэрмінаваныя варыянты і элементы іншамоўных ці агульных з іншымі мовамі прыказак.*

Ключавыя словы: *беларуская мова, спецыфічнае, агульнае, парэмікон, прыказка, нацыянальнае, інтэрнацыянальнае, універсальнае, нацыянальна маркіраваны варыянт, нацыянальна-культурны кампанент*

(Ученые записки. – 2018. – Том 27. – С. 150–154)

National Feature of the Proverbial Fund of the Belarusian Language

Petrushevskaya J.A.
Mogilev State A.A. Kuleshov University

The article defines and differentiates the national component of the proverbial fund (paremikon) of the Belarusian language.

The purpose is to determine the volume and structure of the national (specific) component, the degree of its national and cultural conditionality, the relationship with the non-national (common) component of the paremikon of the Belarusian language.

Material and methods. *The descriptive and comparative methods, the methods of structural and semantic modeling, the linguistic and cultural descriptions, the quantitative analysis and others are used in the study. The research materials are units of the proverbial minimum, units of the main proverbial fund, units of the proverbial stock of the modern literary language (about 1,500 proverbs and more than 5,000 variants of these proverbs).*

Findings and their discussion. *The paremikon of the Belarusian language combines the common components with other languages (international or universal) and specific components (national). The national and distinctive part of the paremikon consists not only of the units of the Belarusian origin, but also of the nationally determined variants of foreign proverbs and proverbs common with other languages. The majority of the proverbs borrowed from other languages or common with other languages have assimilated in the Belarusian language, they take on the characteristics of nationally marked elements so that native speakers perceive these units as proper Belarusian.*

Conclusion. *The nationally determined variants and the elements of foreign proverbs or common with other languages predominate in the national component of the paremikon of the Belarusian language.*

Key words: *the Belarusian language, specific, common, paremikon, proverb, national, international, universal, nationally marked variant, national andcultural component.*

(Scientific notes. – 2018. – Vol. 27. – P. 150–154)

У канцы XX – пачатку XXI стагоддзя ў сувязі з імклівым развіццём лінгвакультуралагічных, этналінгвістычных, лінгвакагнітыўных даследаванняў значна павялічылася ўвага лінгвістаў да высвятлення суадносін нацыянальнага і універсальнага ў моўнай сістэме і яе падсістэмах, асабліва ў фразеалогіі і парэміялогіі, у тым ліку і ў беларускай мове. Велізарную ролю ў фарміраванні і развіцці ў сучаснай лінгвістыцы культуралагічнага і кагнітыўнага кірункаў вывучэння мовы адыгралі працы прафесара В.А. Маславай [1; 2; 3 і інш.].

Асобных даследаванняў, прысвечаных вызначэнню нацыянальнага кампанента прыказкавага фонду беларускай мовы, не праводзілася, за выключэннем прац Я.Я. Іванова, у якіх прапануюцца і абгрунтоўваюцца прынцыпы і метады лінгвакраіназнаўчага апісання нацыянальна-культурнай семантыкі беларускіх моўных афарызмаў, у тым ліку прыказак [4; 5; 6, с. 106–117]. Нацыянальнае (спецыфічнае) адзначаецца і апісваецца мовазнаўцамі пры даследаванні прыказкавых адзінак у межах этналінгвістычнага, лінгвакультуралагічнага, лінгвакраіназнаўчага (а таксама лінгвакраязнаўчага), этымалагічнага, параўнальна-гістарычнага, супастаўляльнага вывучэння беларускай мовы. Пры гэтым аб'ём нацыянальнага кампанента ў беларускай парэміялогіі, як правіла, неапраўдана перабольшваецца, што датычыцца найперш вызначэння ўласна беларускага паходжання прыказак, якія кваліфікуюцца як уласна беларускія на падставе ўжывання ў іх лексічных кампанентаў-рэалій, адлюстравання ў прататыпах прыказак гістарычных, геаграфічных, сацыяльных, культурных умоў жыцця беларускага народа, карэляцыі прыказкавага зместу з духоўным светам беларусаў, наяўнасці ў лексічна-фразеалагічным складзе прыказак кампанентаў, якія адсутнічаюць у іншамоўных прыказкавых адпаведніках і г.д. Найбольш яскрава перабольшванне нацыянальнага кампанента ў прыказкавым фондзе беларускай мовы праяўляецца пры этымалагічным аналізе прыказак [7; 8; 9].

Вызначэнне агульнага (універсальнага) і спецыфічнага (нацыянальна-культурнага) кампанентаў беларускай парэміялогіі на фоне іншых славянскіх і неславянскіх моў з'яўляецца, як было акрэслена Я.Я. Івановым на XV Міжнародным з'ездзе славістаў (Мінск, 2013 г.), адной з актуальных праблем беларускага мовазнаўства [10].

Мэта даследавання – вызначыць аб'ём і структуру нацыянальнага (спецыфічнага) кампанента, ступень яго нацыянальна-культурнай абумоўленасці, суадносіны з іншанацыянальным (агульным) кампанентам у парэміконе беларускай мовы.

Матэрыял і метады. Фактычны матэрыял даследавання – прыказкавыя адзінкі трох аб'ектыўна абмежаваных мностваў у беларускай мове: прыказкавага мінімуму (вызначанага эксперыментальным шляхам М. Ю. Котавай [11] і Я. Я. Івановым [6, с. 99–106]), асноўнага прыказкавага фонду (вызначанага Я. Я. Івановым [6, с. 85–99]) і прыказкавага складу сучаснай літаратурнай мовы (вызначанага І. Я. Лепешавым і М. А. Якалцэвіч [12]), а таксама некаторыя варыянты гэтых адзінак, зафіксаваныя ў парэміялагічных даведніках М. Федароўскага, Ф. М. Янкоўскага, А. С. Аксамітава, Я. Н. Рапановіча, М. Я. Грынблата, З. Ф. Санько, Я. Я. Іванова і інш. (усяго каля 1500 прыказак і больш за 5000 іх варыянтаў).

Метадалагічнай асновай даследавання з'яўляюцца асноўныя палажэнні агульнай парэміялогіі і асобныя палажэнні тэорыі парэміялагічнага складу славянскіх моў, у тым ліку беларускай мовы (распрацаваныя ў даследаваннях Р.Л. Пермякова, В. Мідэра, В.М. Макіенкі, Х. Вальтэра, Д.А. Дабравольскага, Э.М. Саладухі, А.С. Аксамітава, І.Я. Лепешава, Я.Я. Іванова і інш.) У даследаванні выкарыстаны дэскрыптыўны метад, методыкі структурна-семантычнага мадэлявання, фіксацыі, сістэматызацыі і канфрантацыйнага аналізу іншамоўных адпаведнікаў (у кірунку ад беларускай мовы да іншых моў), лінгвакультуралагічнага апісання, колькаснага аналізу.

Вынікі і іх абмеркаванне. Нацыянальная адметнасць прыказкавага фонду (парэмікона) беларускай мовы дэтэрмінавана яго спецыфічнымі (унікальнымі) адзінкамі і адлюстраваннем фактаў беларускай гісторыі і культуры, светапогляду беларусаў у прыказках, але колькасна і якасна абмежавана агульнымі з іншымі мовамі прыказакамі (інтэрнацыянальнымі і універсальнымі). Ступень нацыянальнай адметнасці парэмікона беларускай мовы залежыць ад суадносін у ім нацыянальнага і іншанацыянальнага кампанентаў, якія складаюцца не толькі з асобных прыказкавых адзінак, але таксама і з іх варыянтаў, з элементаў іх формы і зместу. Суадносіны нацыянальнага і іншанацыянальнага

кампанентаў у складзе парэмікона найбольш аб'ектыўна выяўляюцца ў сінхранічным плане і рэпрэзентатыўна адлюстроўваюцца на матэрыяле трох процінастаўленых мностваў прыказак, абмежаваных паводле лінгвістычна значных крытэрыяў: прыказкавага мінімуму (дыяхранічны зрэз парэмікона), асноўнага прыказкавага фонду (сінхранічны зрэз парэмікона), прыказкавага складу літаратурнай мовы (функцыянальны зрэз парэмікона).

Прыказкі, якія ўжываюцца ў беларускай мове, дыферэнцыююцца паводле крытэрыя нацыянальнай дэтэрмінаванасці на дзве процінастаўленыя групы – нацыянальныя (уласна беларускія) і іншанацыянальныя (агульныя з іншымі мовамі). Да нацыянальна дэтэрмінаваных адзінак адносяцца тыя, што не сустракаюцца ў іншых мовах (унікальныя). Напр.: *А калі што якое, дык што тут (там) такое*; *Вялікаму каню – вялікі хамут*; *Галота хоць у балота*; *Гультаю – хлеб на кію*; *Добрае карэнне, добрае і насенне*; *Дурныя жарты плачу варты*; *З музыкі хлеб невялікі*; *Карову б'юць за зык, а бабу за язык*; *Лепей вучоны, як залачоны*; *Не заўсягды, як на Дзяды*; *Праца і рукі – моцныя зарукі*; *Служачы хлеб – сабачы*; *У жыцці згода як у жніво пагода*; *Цянькі адбіраюць дзянькі* і інш. Яны могуць як мець, так і не мець эквіваленты ці адпаведнікі ў іншых мовах.

Агульныя з іншымі мовамі прыказкі размяжоўваюцца ў сінхранічным плане паводле фактару кантактавання моў на два колькасна нераўнаважныя класы адзінак – інтэрнацыянальныя (абумоўленыя моўнымі кантактамі) і ўніверсальныя (не абумоўленыя моўнымі кантактамі). Напр.: *Адна галава добра, а дзве <яшчэ> лепш (лепей)* мае аналагі ў пяцідзесяці сямі мовах свету, што належаць да розных моўных сямей, і з'яўляецца адным з двух варыянтаў універсальнай прыказкі *Two / four / more eyes see more / better / farther than one / two* V1 – *Two heads / brains are better then one* V2, паводле даведніка G. Paczolay "European Proverbs in 55 Languages, with Equivalents in Arabic, Persian, Sanskrit, Chinese, and Japanese" (1997, p. 72–76). Або: *Адзін за ўсіх і ўсе за аднаго* з'яўляецца інтэрнацыянальнай адзінкай, якая ўжываецца ў англійскай, нямецкай, польскай, рускай, украінскай, французскай і інш. мовах і трапіла з беларускую ў выніку запазычання з рускай або з польскай мовы. Нацыянальна дэтэрмінаваныя прыказкі колькасна пераважаюць у прыказкавым складзе літаратурнай мовы (каля 20%), крыху менш прадстаўлены ў прыказкавым мінімуме (больш за 15%) і ўдвая менш – у асноўным прыказкавым фондзе (каля 10%), што сведчыць пра павелічэнне ў ўдзельнай вагі нацыянальна дэтэрмінаваных прыказкавых адзінак у сучаснай беларускай мове.

Нацыянальны кампанент парэмікона беларускай мовы падзяляецца ў семіятычным плане на нацыянальна дэтэрмінаваныя адзінкі як цэласныя знакі (уласна беларускія прыказкі) і на нацыянальна дэтэрмінаваныя элементы іх формы і зместу (нацыянальныя прататыпы прыказак; рэаліі і безэквівалентныя словы ў прыказках; нацыянальныя ўяўленні і вобразы ў прыказках; уласна беларускія прыказкавыя мадэлі; лексіка і фразеалогія ўласна беларускага паходжання ў прыказках). Напр.: *Каб яды, як на Дзяды, а рабіць (працаваць, работы), як у нядзельку* (нацыянальны прататып – вялікая колькасць страў на свята Дзяды, рэалія – *Дзяды*); *Каму па каму, а каму (нам, мне) <дык> два камы* (рэалія – *камы* 'нацыянальная беларуская страва'; прыказкавая мадэль "Каму мала / нешта адно, каму многа / шмат чаго"); *Жыве кот і сабака, ды жытка не аднака* (беларускі прыказкавы наватвор – *жытка*); *Калі няма шчасця зрання, то не будзе да змяркання* (уласна беларуская лексіка – *зрання, змяркання*); *Лепш старожа, як варожа* (уласна беларускія формы – *старожа*, *варожа*) і да т.п. Сярод уласна беларускіх прыказак пераважаюць адзінкі дыскурсіўнага паходжання, што паказвае на прыярытэтную ролю гутарковага маўлення як крыніцы нацыянальна-культурнага кампанента ў прыказкавым фондзе беларускай мовы. Зусім няшмат прыказкавых адзінак, што паходзяць з уласна беларускіх фальклорных ці з літаратурных тэкстаў, напр.: *З рога ўсяго многа* (з беларускай народнай казкі); *Няма таго, што раньш было* (з вершаванага апавядання М. Багдановіча "Вераніка") і інш. Сярод нацыянальна адметных элементаў формы і зместу прыказак пераважаюць уяўленні і вобразы нацыянальнай карціны свету беларусаў, нацыянальна дэтэрмінаваныя прыказкавыя прататыпы, што характарызуе структуру парэміялагічнага фона ў беларускай мове. Напр.: *А калі што якое, дык што тут (там) такое*; *Галота хоць у балота*; *Душа як лес*; *Лёгка сказаць, ды далёка дыбаць*; *Не было б тое, было б што другое*; *Не заўсягды, як на Дзяды*; *Няма лепшага панства, як гаспадарства*; *Няма той (тае) крамы, каб прадаваліся мамы*; *Хата рагата*; *Цянькі адбіраюць дзянькі* і да т.п. Нацыянальна дэтэрмінаваныя элементы формы і зместу характэрны для значнай колькасці прыказак уласна беларускага паходжання, што

сведчыць аб дастаткова высокай ступені іх нацыянальна-культурнай маркіраванасці.

Іншанацыянальны кампанент парэмікона беларускай мовы членіцца паводле суаднесенасці формы і зместу з нацыянальнай культурай беларусаў на іншанацыянальна маркіраваныя, нейтральныя і акультураваныя прыказкі. У выніку акультурацыі ўзнікаюць нацыянальна дэтэрмінаваныя варыянты і элементы інтэрнацыянальных і ўніверсальных прыказкавых адзінак (нацыянальныя варыяцыі прыказкавых прататыпаў, рэаліі ў лексічным складзе прыказак, спецыфічныя вобразы і паняцці ў прыказках, унікальныя варыянты прыказкавых мадэляў, лексічнага складу і граматычнай арганізацыі прыказак). Напр.: *Ліхтаром пушчы не асвеціш* (нацыянальны прататып – "ліхтар свеціць у пушчы", параўн. руск. *Искрой избы не осветишь*); *Язык Вільні дапытае* (рэалія – *Вільня*, параўн. ісп. *Quien boca ha, a Roma va*, іт. *Chi lingua ha a Roma va*, польск. *Język i do Krakowa (Rzymu) doprowadzi*, руск. *Язык до Киева доведёт*, укр. *Язик до Києва доведе*, фр. *Qui langue a, à Rome va*); *Каму густа, <а> каму пуста* (беларуская прыказкавая мадэль "Яму / таму многа, а яму / таму нічога" як варыянт інтэрнацыянальнай прыказкавай мадэлі "Аднаму / іншым многа, а іншаму / іншым / нам нічога", параўн. польск. *Jednym rydz, drugim nic*, руск. *У кого густо, а у нас пусто*, укр. *Один му густо, а другому пусто*); *Круцячы (круцельствам, хітрасцю) свет пройдзеш, але назад не вернешся* (адметныя лексічныя кампаненты – *круцельствам*, *хітрасцю*, параўн. польск. *Kłamstwem świat przejdziesz, ale się nie wrócisz*, руск. *Кривдой свет пройдёшь, да назад не вернёшься*, укр. *З неправдою світ пройдеш, а назад не вернешся*); *Хоць і відаць, але (ды) далёка дыбаць* (іншая мадэль складанага сказа – складаназалежны сказ, параўн. бяззлучнікавы сказ у польск. *Blisko widać, daleko dybać*, складаназлучаны сказ у руск. *Близко видать, да далеко шагать*, укр. *Близько видати, та далеко дибати*) і да т.п. Удзельная вага акультураваных адзінак перавышае 70% інтэрнацыянальных і ўніверсальных прыказак, што сведчыць аб высокай ступені нацыянальнай дэтэрмінаванасці іншанацыянальнага кампанента парэмікона беларускай мовы.

Колькасць інтэрнацыянальных і ўніверсальных адзінак амаль у чатыры разы перавышае колькасць уласна беларускіх прыказак у парэміконе беларускай мовы, што паказвае на ўбудаванасць яе прыказкавага фонду ў агульнаславянскі і агульнаеўрапейскі парэміялагічны кантынуум. Разам з тым удзельная вага нацыянальна-культурна маркіраваных прыказкавых адзінак уласна беларускага паходжання роўная ўдзельнай вазе нацыянальна-культурна дэтэрмінаваных паводле формы і зместу інтэрнацыянальных і ўніверсальных прыказак, што сведчыць аб высокай ступені нацыянальна-культурнай адметнасці прыказкавых адзінак беларускай мовы.

Заключэнне. У выніку даследавання вызначана методыка выяўлення нацыянальнага кампанента ў парэміконе беларускай мовы на падставе дыферэнцыяцыі спецыфічнага (нацыянальна дэтэрмінаванага) і агульнага з іншымі мовамі (іншанацыянальнага) у сінхранічным плане на матэрыяле прыказкавага мінімуму, асноўнага прыказкавага фонду, прыказкавага складу літаратурнай мовы. Вызначаны і дыферэнцыяваны адзінкі, якія належаць да нацыянальнага і іншанацыянальнага (інтэрнацыянальнага і ўніверсальнага) кампанентаў парэмікона беларускай мовы, вызначаны інтэрнацыянальны характар каля 1000 прыказак, устаноўлена прыналежнасць да ўніверсальных адзінак больш за 70 прыказак, якія ўжываюцца ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

Комплексна дыферэнцыявана нацыянальна-культурная семантыка ўласна беларускіх прыказкавых адзінак, вызначана і ранжыравана структура парэміялагічнага фона, устаноўлена ступень нацыянальнай дэтэрмінаванасці формы і зместу прыказак уласна беларускага паходжання, вызначана каля 300 адзінак, якія ўтвараюць нацыянальны кампанент прыказкавага складу сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Устаноўлена нацыянальна-культурная маркіраванасць іншанацыянальнага кампанента парэмікона беларускай мовы, вызначаны і дыферэнцыяваны нацыянальна абумоўленыя варыянты і элементы інтэрнацыянальных і ўніверсальных прыказкавых адзінак, вызначана ступень нацыянальнай дэтэрмінаванасці інтэрнацыянальнага і ўніверсальнага кампанентаў прыказкавага складу сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Вызначаны суадносіны паміж нацыянальным і іншанацыянальным кампанентамі парэмікона беларускай мовы, устаноўлена і дыферэнцыявана ступень нацыянальна-культурнай адметнасці прыказкавых адзінак беларускай мовы.

Вынікі даследавання маюць тэарэтычную і эмпірычную значнасць у лінгвакультуралагічным і этналінгвістычным апісанні беларускай мовы (у прыватнасці нацыянальна-культур-

най семантыкі беларускіх прыказак), а таксама з'яўляюцца важнымі ў прыкладным плане ў сферы лінгвадыдактыкі пры выкладанні беларускай мовы як роднай (у лінгвакультуралагічным і лінгвакраязнаўчым аспекце), як замежнай і як няроднай ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму (у лінгвакраіназнаўчым аспекце), у галіне нарматыўнай і вучэбнай лексікаграфіі (у межах гістарычна-этымалагічнай зоны слоўніка) і двухмоўнай лексікаграфіі (пры ўкладанні іншамоўна-беларускіх парэміялагічных слоўнікаў), у тэорыі і практыцы перакладу публіцыстычных і літаратурна-мастацкіх тэкстаў (з беларускай на іншыя мовы).

Літаратура

1. Маслова, В. А. Лингвокультурология : учеб. пособие для вузов / В. А. Маслова. – 3-е изд., испр. – М. : Академия, 2007. – 202 с.
2. Маслова, В. А. Когнитивная лингвистика : учеб. пособие / В. А. Маслова. – 3-е изд. – Мінск : ТетраСистемс, 2008. – 272 с.
3. Маслова, В.А. Homo lingualis в культуре : монография / В. А. Маслова. – М. : Гнозис, 2007. – 319 с.
4. Іваноў, Я.Я. Нацыянальна-культурная семантыка беларускай мовы і праблема яе лінгвакраіназнаўчай рэпрэзентацыі (на матэрыяле моўнай афарыстыкі) / Я. Я. Іваноў // Сацыякультурная прастора мовы (сацыяльныя і культурныя аспекты вывучэння беларускай мовы) : манаграфія / С. Ф. Іванова, Я. Я. Іваноў, Н. Б. Мячкоўская. – Мінск : Веды, 1998. – С. 33–62.
5. Іваноў, Я.Я. Нацыянальна-культурная семантыка беларускай мовы як аб'ект лінгвакраіназнаўства (пры вывучэнні беларускай мовы як замежнай і як другой ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму) / Я. Я. Іваноў // Беларуская мова: шляхі развіцця, кантакты, перспектывы / рэдкал.: Г. Цыхун (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. – С. 285–290. – ("Беларусіка = Albaruthenica". Кн. 19)
6. Іваноў, Я.Я. Афарыстычныя адзінкі ў беларускай мове : манаграфія / Я. Я. Іваноў. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2017. –Петрушэўская, Ю.А. Пра сферу ўжывання і паходжанне прыказкі *Адна галава добра, а дзве лепш* / Ю. А. Петрушэўская // Вестник Минского гос. лингв. ун-та. Серия 1, Филология. – 2015. – № 5 (78). – С. 84–96.
7. Петрушэўская, Ю.А. Пра сферу ўжывання і паходжанне прыказкі *З вялікага грому малы дождж* / Ю. А. Петрушэўская // Роднае слова. – 2016. – № 1. – С. 44–47.
8. Петрушэўская, Ю. А. Пра сферу ўжывання і паходжанне прыказкі *Хто мажа, той і едзе* / Ю. А. Петрушэўская // Вестник Полоцкого гос. ун-та. Серия А, Гуманитар. науки. – 2016. – № 2. – С. 138–144.
9. Иванов, Е. Е. Белорусская паремиология и афористика в общеевропейском контексте (актуальные проблемы изучения) / Е. Е. Иванов // Nationales und Internationales in der slawischen Praseologie = Национальное и интернациональное в славянской фразеологии : XV Междунар. съезд славистов, Минск, 20–27 августа 2013 г. : [kollektive Monographie] / Internationales Slawistenkomitee, Phraseologische Kommission ; Hrsg. H. Walter, V. M. Mokienko. – Greifswald : E. M. A.-Universität, 2013. – S. 111–116.
10. Котова, М. Ю. Русско-славянский словарь пословиц (с английскими соответствиями) / М. Ю. Котова ; под ред. П. А. Дмитриева. – Санкт-Петербург : Изд-во СПбГУ, 2000. – 360 с.
11. Лепешаў, І. Я. Слоўнік беларускіх прыказак / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. – [2-е выд., дап.]. – Мінск : Беларуская навука, 2002. – 511 с.

Паступіў у рэдакцыю 17.12.2018 г.